Міністрэства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________ А.І. Жук
__11.11.2008__
Рэгістрацыйны № ТД-А.063/тып.

# АГУЛЬНАЕ МОВАЗНАЎСТВА

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях:**
**1 - 02 03 01 Беларуская мова і літаратура;**
**1 - 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць**

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай адукацыі
________ П.Дз. Кухарчык
__29.05.08__

**УЗГОДНЕНА**
Першы прарэктар Дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"
________ І.В. Казакова
__21.10.2008__

Начальнік Упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
________ Ю.І. Міксюк
__11.11.2008__

Эксперт-нормакантралёр
________
__21.10.08__

Мінск 2008

**СКЛАДАЛЬНІК**
**В.І.** Рагаўцоў, загадчык кафедры беларускай мовы ўстановы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова", доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кафедра беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава";
Дз.В. Дзятко, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
Кафедрай беларускай мовы ўстановы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова"
(пратакол № 7 ад 24 сакавіка 2008 г.);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя А.А. Куляшова"
(пратакол № 8 ад 16 красавіка 2008 г.);

Навукова-метадычным саветам па гуманітарнай адукацыі вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай адукацыі
(пратакол № 3 ад 27 мая 2008 г.)

Адказны за выпуск: П.А. Міхайлаў

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма новага пакалення па дысцыпліне "Агульнае мовазнаўства" прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыклу спецыяльных дысцыплін. Ад папярэдняга тыпу вучэбнай праграмы яе адрозніваюць: абноўлены і перакампанаваны змест, арыентацыя на кампетэнтнасны падыход у навучанні, значнае ўзмацненне ролі і часткі самастойнай работы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій.

Вучэбная праграма "Агульнае мовазнаўства" распрацавана ў адпаведнасці з наступнымі нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі:

- Адукацыйны стандарт ОСРБ 1-02 03 01-2008 "Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Цыкл спецыяльных дысцыплін" (зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 15.05.2008 г.);
- Метадычныя рэкамендацыі для распрацоўшчыкаў тыпавых вучэбных праграм, МА РБ, 2007;
- Парадак распрацоўкі, зацвярджэння і рэгістрацыі вучэбных праграм для першай ступені вышэйшай адукацыі (зацверджана МА РБ ад 28.12.2007 г.);
- Тыпавы вучэбны план А 02 - 027 ТИП, зацверджаны 14.05.2008 г.

У вучэбнай праграме ўлічаны наступныя патрабаванні адукацыйнага стандарта:

## I.Агульныя патрабаванні да фарміравання сацыяльна-асобасных камне гэнцый выпускніка

Асноўнымі мэтамі навучання студэнтаў у ВНУ з'яўляюцца падрыхтоўка высокапрафесійных спецыялістаў у адпаведнай галіне народнай гаспадаркі і фарміраванне сацыяльна-асобасных кампетэнцый.

Агульныя патрабаванні да фарміравання сацыяльна-асобасных кампетэнцый выпускніка вызначаюцца наступнымі прынцыпамі:

- прынцып *гуманізацыі* як прыярытэтны прынцып адукацыі, што забяспечвае асобасна-арыентаваны характар адукацыйнага працэсу і творчую самарэалізацыю выпускніка;

- прынцып *фундаменталізацыі,* які садзейнічае арыентацыі зместу дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу на выяўленне сутнасных асноў і сувязей паміж разнастайнымі працэсамі навакольнага свету, прыродазнаўчымі і гуманітарнымі ведамі;

- прынцып *кампетэнтнасці,* што накіраваны на ўзмацненне практычнай арыентаванасці вучэбнага працэсу, павышэнне ролі самастойнай работы студэнтаў і фарміраванне ў выпускнікоў здольнасці дзейнічаць самастойна ў зменлівых жыццёвых сітуацыях;

- прынцып ***сацыяльна-асобаснай падрыхтоўкі,*** які забяспечвае фарміраванне ў студэнтаў кампетэнтнасці, заснаванай на набытых ведах і сфарміраваных умениях з улікам інтарэсаў, патрэб і магчымасцей навучэнцаў;
- прынцып ***міждысцыплінарнасці і інтэгратыўнасці*** адукацыі, рэалізацыя якога забяспечвае цэласнасць засваення гуманітарных ведаў і іх узаемасувязь з будучай прафесійнай дзейнасцю выпускніка.

У адпаведнасці з названымі мэтамі і прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі выпускнік вышэйшай навучальнай установы пры падрыхтоўцы па адукацыйнай праграме першай ступені (спецыяліст) павінен набыць наступныя ***сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

- культурна-вартаснай і асобаснай арыентацыі;
- грамадзянскасці і патрыятызму;
- сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- камунікацыі;
- захавання і ўмацавання здароўя;
- самаўдасканалення.

Выпускнік у працэсе сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі павінен развіць і ўдасканаліць наступныя ***метапрадметныя кампетэнцыі:***

- валоданне метадамі сістэмнага і параўнальнага аналізу;
- сфарміраванасць крытычнага мыслення;
- умение працаваць у калектыве;
- валоданне навыкамі праектавання і прагназавання;
- сфарміраванасць самастойнасці, адказнасці, арганізаванасці, мэтанакіраванасці і матывацыйна-каштоўнаснай арыентацыі;
- здольнасць вучыцца, пастаянна павышаць кваліфікацыю.

## 2. Мэты і заданы дысцыпліны "Агульнае мовазнаўства"

"Агульнае мовазнаўства" - дысцыпліна, якая знаёміць студэнтаў з кароткай гісторыяй навукі пра мову (з асноўнымі лінгвістычнымі кірункамі і школамі, з поглядамі найбольш буйных прадстаўнікоў агульнага мовазнаўства), з найважнейшымі пытаннямі тэорыі мовы, традыцыйнымі і найноўшымі метадамі вывучэння мовы.

Праграма прадмета "Агульнае мовазнаўства" дапаможа студэнтам сістэматызаваць набытыя веды пры вывучэнні ўсіх іншых лінгвістычных дысцыплін, удасканаліць навыкі крытычнага аналізіу найбольш складаных моўных з'яў.

### Асноўныя мэты выкладання дысцыпліны:

- развіваць і ўдасканальваць філалагічнае мысленне студэнта;
- пашырыць і паглыбіць тэарэтычныя веды студэнтаў;

- удасканаліць навыкі крытычнага аналізу найболып складаных моўных з'яў;
- сфарміраваць навыкі практычнага ўкаранення атрыманых студэнтамі ведаў у іх будучай прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;
- выхоўваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэтыфікацыі.

**Заданы вывучэння дысцыпліны:**

- азнаёміць студэнтаў з развіццём ведаў пра мову і яго тэарэтычным асэнсаваннем;
- узбагаціць веды студэнтаў пра сутнасць, структуру і сістэму мовы на фаналагічным, марфемным, лексічным і сінтаксічных узроўнях;
- даць неабходныя звесткі пра асноўныя праблемы і прынцыпы метадалогіі лінгвістычных даследаванняў, традыцыйныя і болын новыя метады вывучэння мовы;
- садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных практычна выкарыстоўваць набытыя веды пры вывучэнні спецыяльных мовазнаўчых дысцыплін.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

- найважнейшыя лінгвістычныя традыцыі да XVIII ст., асноўныя лінгвістычныя кірункі і школы XIX і XX стст.;
- сутнасць мовы, яе функцыі, асноўныя канцэпцыі суадносін мовы і мыслення, мовы і маўлення, мовы і культуры;
- унутраную будову мовы, моўныя адзінкі і іх узаемадзеянне;
- сувязь мовы і грамадства;
- формы існавання мовы;
- заканамернасці моўных змен і своеасаблівасць развіцця чалавечай мовы;
- асноўныя метады і прыёмы лінгвістычнага аналізу;
- навуковую і даведачную літаратуру па дадзенай галіне мовазнаўчай навукі;

**умець:**

- адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты;
- праводзіць лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;
- заўважаць агульнае і адметнае ў моўных фактах розных моў;
- карыстацца слоўнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі і дадатковай літаратурай;
- выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы.

## 3. Структура зместу вучэбнай дысцыпліны

Вывучэнне дысцыпліны "Агульнае мовазнаўства" разлічана на 116 вучэбных гадзін, з якіх 44 - аўдыторныя; прыкладнае размеркаванне па відах заняткаў уключае 34 лекцыйных і 10 практычных (семінарскіх) гадзін, 2 гадзіны адводзіцца на кантроль за самастойнай працай студэнтаў (КСР).

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дадзенай дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Найболып перспектыўныя і эфектыўныя сучасныя інавацыйныя адукацыйныя сістэмы і тэхналогіі наступныя: вучэбна-метадычны комплекс, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы студэнтаў, блочна-модульная, модульна-рэйтынгавая і крэдытная сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае ўводзіны і вучэбныя раздзелы (тэмы).

## 4. Метады навучання

Найболып эфектыўнымі педагагічнымі методыкамі і тэхналогіямі, што садзейнічаюць уключэнню студэнтаў у пошук і кіраванне ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, з'яўляюцца:

- тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці;
- тэхналогія праблемна-модульнага навучання;
- праектныя тэхналогіі;
- камунікатыўныя тэхналогіі і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці педагогам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

З мэтай фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх і практычных заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання і дыскусійныя формы.

## 5. Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца дэканатамі, кафедрамі, выкладчыкамі ВНУ ў адпаведнасці з Палажэннем аб самастойнай працы студэнтаў.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне кантрольных прац, падрыхтоўку вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў па вызначанай тэматыцы, знаёмства з навуковай, навукова-папулярнай, хрэстаматыйнай літаратурай, рэфераванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў і інш.

## 6. Дыягностыка сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнта

Адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені сацыяльна-гуманітарных дысцыплін вызначаецца наступная працэдура дыягностыкі сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнтаў.

**1. Патрабавпнні да ажыццяўлення дыягностыкі:**

- вызначэнне аб'екта дыягностыкі;
- выяўленне ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнта пры дапамозе крытэрыяльна-арыентаваных тэстаў і іншых сродкаў дыягностыкі;
- карэкціраванне ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнта ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандарта;
- ацэнка вынікаў дыягностыкі вучэбных дасягненняў студэнта ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандарта (па шкале адзнак).

**2. Шкала адзнак:**

- ацэнка вучэбных дасягненняў студэнта на экзаменах па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыклу праводзіцца па дзесяцібальнай шкале (1, 2...9, 10);
- ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў, якая вызначаецца паэтапна па канкрэтных тэмах вучэбнай дысцыплшы і ажыццяўляецца кафедрай у адпаведнасці з выбранай ВНУ шкалой адзнак.

**3. Крытэрыі адзнак**

Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў прымяняюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**4. Дыягнастычны інструментарый**

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах (залік, экзамен) рэкамендуецца выкарыстоуваць тэсты і тэставыя заданні, рознаўзроўневыя кантрольныя заданні; залік; экзамен.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| | Назвы тэм | Усяго аўдытрных гадзін | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Лекцыі | Практычныя заняткі |
| **1.** | **Уводзіны** | | 1 | |
| **2.** | **Кароткая гісторыя мовазнаўства** | 9 | 9 | |
| **2.1.** | Гістарычныя передумовы мовазнаўства як навукі | 1<br>1 | 1 | |
| **2.2.** | Мовазнаўства ў эпоху Сярэднявечча і Адраджэння | 1<br>1 | 1 | |
| **2.3.** | Параўнальна-гістарычнаемовазнаўства | 1 | 1 | |
| **2.4.** | Развіццё кампаратывістыкі ў другой палове XIX ст. | 1 | 1 | |
| **2.5.** | Младаграматычны кірунак у мовазнаўстве | | 1 | |
| **2.6.** | Ф. дэ Сасюр (1857-1913) як заснавальнік тэарэтычнай лінгвістыкі | | 1 | |
| **2.7.** | Структуралізм у мовазнаўстве | 2 | 2 | |
| **2.8.** | Развіццё ўсходнеславянскага мовазнаўства ў XX ст. | 1 | 1 | |
| **3.** | **Тэорыя мовы** | 28 | 18 | 10 |
| **3.1.** | Структура мовазнаўства і яго сувязь з іншымі навукамі | 4 | 2 | 2 |
| **3.2.** | Мова як знакавая сістэма | 2 | 2 | |
| **3.3.** | Мова і грамадства | 4 | 2 | 2 |
| **3.4.** | Фаналогія | 4 | 2 | 2 |
| **3.5.** | Граматыка | 4 | 2 | 2 |
| **3.6.** | Марфеміка | 2 | 2 | |
| **3.7.** | Лексікалогія | 2 | 2 | |
| **3.8.** | Мова як гістарычная з'ява | 2 | 2 | |
| **3.9.** | Лінгвістычная тыпалогія | 4 | 2 | 2 |
| **4.** | **Метады даследавання мовы** | 6 | 6 | |
| | **Усяго:** | 44 | 34 | 10 |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІШЫ

**1. Уводзіны.** Мэта і заданы "Агульнага мовазнаўства", яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін. Роля прадмета ў прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў-філолагаў. Асноўныя навучальныя дапаможнікі па агульным мовазнаўстве.

**2. Кароткая гісторыя мовазнаўства.**

**2.1. Гістарычныя перадумовы мовазнаўства як навукі.** Вывучэнне мовы ў старажытныя часы. Мовазнаўства ў старажытнай Індыі. Граматыка Паніні (V ст. да н. э.). Эмпірычнае апісанне ў граматыцы Паніні фанетыкі і марфалогіі санскрыту. Мовазнаўства ў старажытнай Грэцыі. Філасофскі перыяд (V - III стст. да н. э.) грэчаскага мовазнаўства (распрацоўка праблем паходжання мовы, прыроды назвы, суадносін мовы і мыслення). Пытанні мовазнаўства ў працах Арыстоцеля (384-322 гг. да н. э.). Уклад стоікаў у распрацоўку граматычных праблем. Александрыйскі, або граматычны, перыяд (III ст. да н. э. - IV ст. н. э.) у вывучэнні мовы. Даследаванні александрыйскіх граматыстаў у галіне фанетыкі і граматыкі. Мовазнаўства ў старажытным Рыме. Найважнейшыя працы старажытнарымскіх мовазнаўцаў. Значэнне антычных даследаванняў мовы ў станаўленні мовазнаўства як навукі.

**2.2. Мовазнаўства ў эпоху Сярэднявечча і Адраджэння.** Лінгвістычныя даследаванні ў часы Сярэднявечча (V - XV стст. н. э.). Праблема сутнасці мовы і сутнасці найменняў у сярэднявечнай філасофіі. Пытанне пра паходжанне мовы. Дасягненні арабскага (дзяржава Арабскі Халіфат, VII - XIII стст.) мовазнаўства ў галіне граматыкі і лексікаграфіі. Мовазнаўства ў эпоху Адраджэння (XIV - XVII стст.). Станаўленне нацыянальных моў і іх вывучэнне. Першыя славянскія граматыкі, граматыкі Л. Зізанія (1596) і М. Сматрыцкага (1619). "Граматыка агульная і рацыянальная" (1660) А. Арно і К. Лансло. Натуралістычныя тэорыі паходжання мовы (выклічнікавая, гукапераймальная, сацыяльнай дамоўленасці) у французскай і нямецкай філасофіі XVIII ст. (Ж. Русо, Д. Дзідро, Г. Лейбніц, І. Гердэр). Лексікаграфічныя працы П. Паласа ("Параўнальныя слоўнікі ўсіх моў і народаў", 1787-1789; 2 выд., 1790-1791), Л. Герваса ("Каталог моў вядомых народаў...", 1784; 2 выд., 1800-1804), І. Адэлунга і І. Фатэра ("Мітрыдат, або Агульнае мовазнаўства", 1806-1817). "Расійская граматыка" (1755) М.В. Ламаносава.

**2.3. Параўнальна-гістарычнае мовазнаўства.** Найважнейшыя перадумовы для ўзнікнення параўнальна-гістарычнага мовазнаўства (росквіт жывых літаратурных моў, стварэнне перакладных слоўнікаў, адкрыццё еўрапейцамі старажытнаіндыйскай мовы санскрыту, практычная работа па напісанні граматык і слоўнікаў розных моў). Спроба І. Скалігера сістэматызаваць усе еўрапейскія мовы ў кн. "Разважанні пра еўрапейскія мовы" (1599). У. Джоунз (1746-1794) пра паходжанне некаторых еўрапейскіх моў (грэчаскай, лацінскай, гоцкай і

інш.) і санскрыту з агульнай прамовы. Ф.Шлегель (1772-1829) пра роднасць санскрыту з лацінскай, грэчаскай, германскай і персідскай мовамі. Ф.Боп (1791-1867) пра гістарычную роднасць індаеўрапейскіх моў. Р.Раск (1787-1832) пра агульную для еўрапейцаў мову-крыніцу, пра падабенства моў, прынцыпы навуковай этымалогіі слоў і параўнальнага апісання моў. "Нямецкая граматыка" (1819-1837) Я.Грыма (1785-1863). А.Х.Вастокаў (1781-1864) пра перыядызацыю развіцця славянскіх і рускай моў, гукавое значэнне насавых галосных, гукавыя працэсы, звязаныя з стратай рэдукаваных, пра першую і другую палаталізацыю, пра лексічныя крытэрыі вызначэння ступені роднасці моў (першасныя і другасныя словы).

**2.4. Развіццё кампаратывістыкі ў другой палове XIX ст.** (А.Пот, Ф.Дыц, Ф.Міклашыч). Значэнне ўзнікнення параўнальна-гістарычнага мовазнаўства. Праўнальна-гістарычнае даследаванне моў у сучасны перыяд.

В.Гумбальт (1767-1835) як заснавальнік агульнага мовазнаўства. Філасофская база лінгвістычнай канцэпцыі В.Гумбальта. Мова як дынамічная з'ява. Супярэчнасці - аснова развіцця мовы. В.Гумбальт пра асноўныя законы развіцця мовы. Унутраная і знешняя форма мовы. Вызначэнне сутнасці мовы як адначасова сацыяльнай і псіхалагічнай з'явы. Мова і дух народа. Мова і інтэлектуальная дзейнасць народа. Актыўнасць мовы ў дачыненні да мыслення і духоўнага жыцця чалавека. Суадносіны мовы і мыслення. В.Гумбальт - адзін з заснавальнікаў марфалагічнай класіфікацыі моў. Меркаванне пра дасканалыя і недасканалыя мовы. Уплыў В.Гумбальта на развіццё* мовазнаўства. Неагумбальтыянства.

А.Шляйхер (1821-1868) як заснавальнік натуралістычнага кірунку ў лінгвістыцы. Мова і прыродны арганізм. Гіпотэза пра два перыяды ў развіцці мовы. Асноўныя тыпы моў паводле марфалагічнай класіфікацыі А.Шляйхера. Стадыянальнасць у развіцці моў. Тэорыя радаслоўнага дрэва індаеўрапейскіх моў. Прамова і яе рэканструкцыя.

Г.Штайнталь (1823-1899) як заснавальнік псіхалагічнай школы ў мовазнаўстве. Псіхалагічная трактоўка сутнасці і працэсаў развіцця мовы.

Агульналінгвістычныя погляды А.А.Патабні (1835-1891). Крытыка натуралістычнага вучэння пра мову А.Шляйхера. Вучэнне пра сувязь мовы і мыслення ў розныя перыяды гісторыі чалавецтва. Роля А.А.Патабні ў станаўленні псіхалагічнага кірунку ў мовазнаўстве. Псіхалагічная трактоўка агульных пытанняў паходжання і развіцця мовы. Вучэнне пра знакавы характар мовы. Вучэнне пра слова. Паняцце ўнутранай і знешняй формы слова. Бліжэйшае і далейшае значэнні слова. Вучэнне пра полісемію і аманімію. Граматычныя даследаванні А.А.Патабні. Трактоўка граматычнай формы. Выражэнне граматычных форм у мове. Адметнасць суадносін граматычных і лагічных катэгорый.

А.А.Патабня пра эвалюцыю часцін мовы. Тэорыя стадыяльнасці ў развіцці сказа.

**2.5. Младаграматычны кірунак у мовазнаўстве** (Г.Пауль, К.Бругман, Г.Остгаф, А.Лескін, Б.Дэльбрук). Младаграматысты пра актуальнасць вывучэння жывых моў, пра найважнейшыя навуковыя прынцыпы вывучэння мовы (псіхалагізм, індывідуалізм, гістарызм, атамізм). Вучэнне пра фанетычныя законы і змяненне значэнняў слоў. Роля аналогіі ў развіцці мовы. Роля ідэй младаграматыстаў у развіцці лінгвістычных кірункаў (дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, эстэтызму) і школ.

Праблемы агульнага мовазнаўства ў працах І.А.Бадуэна дэ Куртэнэ (1845-1929). Тэорыі фанемы (марфалагічная, псіхалагічная і антрапафанічная) і іх сутнасць. Прычыны развіцця мовы. Вучэнне пра суадносіны мовы і маўлення, статыкі (сінхраніі) і дынамікі (дыяхраніі), племянной (нацыянальнай), індывідуальнай і сярэдняй моў. Гістарычны характар сістэмы мовы. Пытанні тыпалогіі моў і структуры мовазнаўства ў працах І.А.Бадуэна дэ Куртэнэ.

Пытанні агульнага мовазнаўства ў працах П.Ф.Фартунатава (1848—1914). Суадносіны мовы і мыслення. Адрозненне знешняй і ўнутранай гісторыі мовы. Вучэнне пра форму слова. Формы словаўтварэння і формы словазмянення. Асноўныя і фармальныя адзнакі слова. Фармальная класіфікацыя часцін мовы. Вучэнне пра словазлучэнне. Граматычныя і неграматычныя словазлучэнні. Пытанні параўнальна-гістарычнага мовазнаўства ў працах П.Ф.Фартунатава. Вучэнне пра генезіс індаеўрапейскай прамовы. Даследаванні ў галіне акцэнталогіі індаеўрапейскіх моў. Акцэнталагічны закон Фартунатава. Высновы пра заканамернасці моўных змен (фанетычных, акцэнтавых, марфалагічных). Тыпалагічная класіфікацыя моў.

**2.6. Ф.** дэ **Сасюр (1857-1913) як заснавальнік сучаснай тэарэтычнай лінгвістыкі.** Праблемы агульнага мовазнаўства ў працах Ф. дэ Сасюра. Вызначэнне спецыфікі мовазнаўства як навукі. Адрозненне мовы і маўлення як двух аспектаў маўленчай дзейнасці. Знешняя і ўнутраная лінгвістыка, сінхранія і дыяхранія. Сістэмнасць мовы. Сінтагматычныя і асацыяцыйныя (парадыгматычныя) адносіны паміж моўнымі знакамі. Азначальнае (план выражэння) і азначаемае (план зместу) моўнага знака. Значнасць (вартасць) знака. Значнасць і значэнне. Уласцівасці моўнага знака. Адвольнасць (нематываванасць) сувязі азначальнага і азначаемага і абавязковасць знака для мовы. Роля Ф. дэ Сасюра ва ўзнікненні сацыяльнай лінгвістыкі і лінгвасеміётыкі. Уплыў ідэй Ф. дэ Сасюра на развіццё сучаснай лінгвістыкі (структуралізму).

**2.7. Структуралізм у мовазнаўстве.** Найважнейшыя агульныя канцэпцыйныя палажэнні розных школ структуралізму.

Пражскі лінгвістычны гурток (Пражская школа функцыянальнай лінгвістыкі). Стварэнне фаналогіі як навуковай дысцыпліны. Фаналагічная тэорыя М.С.Трубяцкога. Даследаванні пражцаў у галіне

граматыкі (У.Скалічка, Р.Якабсон, В.Матэзіус). Тыпалагічныя даследаванні пражскіх структуралістаў.

Дэскрыптыўная лінгвістыка (амерыканскі структуралізм). Погляды Э.Сэпіра і Л.Блумфілда на мову. Уклад амерыканскіх структуралістаў (З.Харыс, Н.Хомскі, Ч.Хокет і інш.) у распрацоўку метадаў лінгвістычнага аналізу. Дыстрыбуцыйны аналіз. Метад непасрэдна складальных. Трансфармацыйны метад.

Гласематыка (капенгагенская школа структуралізму). Лагічныя асновы гласематыкі Л.Ельмслева. Адцягненасць і схематызм у тэарэтычных пабудовах гласематыкаў.

**2.8. Развіццё ўсходнеславянскага мовазнаўства ў ХХ ст.** Праблема суадносін мовы і грамадства ў мовазнаўстве 20-30-х гадоў (Р.В.Шор, В.М.Жырмунскі, Л.П.Якубінскі і інш.). Агульналінгвістычныя погляды Л.У.Шчэрбы (1880-1944). "Новае вучэнне пра мову" М.Я.Мара (1864/65-1934). Агульналінгвістычныя праблемы ў працах Я.Дз.Паліванава (1891-1938). Агульналінгвістычныя погляды А.І.Смірніцкага (1902/03-1954). Тыпалагічная канцэпцыя І.І. Мешчанінава (1883-1967). Агульналінгвістычныя праблемы ў працах В.У.Вінаградава (1894/95-1969) (граматычнае вучэнне пра слова, лексікалогія і фразеалогія, сінтаксічная тэорыя, моўныя стылі, мова мастацкай літаратуры).

Уклад усходнеславянскіх лінгвістаў у тэорыю мовазнаўства.

Мовазнаўства на сучасным этапе (антрапацэнтрычны кірунак, пераарыентацыя з аналізу на сінтэз, пашырэнне колькасна-статыстычных метадаў, лінгвістычная універсалогія, камп'ютэрная лінгвістыка, тэорыя маўленчых актаў і маўленчага ўздзеяння, функцыянальная граматыка, макракампаратывістыка і інш.).

**3. Тэорыя мовы.**

**3.1. Структура мовазнаўства і яго сувязь з іншымі навукамі.** Мовазнаўства як навука і яго будова (агульнае і прыватнае, тэарэтычнае і прыкладное (дастасоўнае), апісальнае і гістарычнае, знешняе і ўнутранае, супастаўляльнае і тыпалагічнае). Найважнейшыя праблемы агульнага мовазнаўства (прырода і сутнасць мовы, мова і мысленне, мова і культура, мова і грамадства, узнікненне, развіццё і ўдасканаленне мовы, распрацоўка метадаў даследавання мовы і інш.). Асноўныя раздзелы (падраздзелы) унутранага мовазнаўства.

Сувязь мовазнаўства з іншымі навукамі (гуманітарнымі, прыродазнаўчымі, дакладнымі).

Паняцце пра метамову. Элементы (сродкі) метамовы. Лексічныя асаблівасці метамовы. Адметнасць метамовы розных лінгвістычных школ і індывідуальных навуковых канцэпцый.

Мова і мысленне. Асноўныя канцэпцыі суадносін мовы і мыслення: мова і мысленне тоесныя між сабой (Ф. Шляермахер, І.Г. Гаман, М. Мюлер), мова і мысленне як еднасная, непадзельная з'ява (В. Гумбальт, Ф. дэ Сасюр, І.І. Мешчанінаў, Л.У. Шчэрба), мова і мысленне

суадносяцца як форма і змест (А. Шляйхер, Э. Бенвеніст), мова і мысленне - самастойныя з'явы (Ж. Адамар, А. Эйнштэйн, Р. Якабсон).

Генетычныя сувязі мовы і мыслення. Фізіялагічныя, сацыяльныя і гістарычныя фактары развіцня мовы і мыслення. Асаблівая роля працы ў станаўленні чалавека, абстрактнага мыслення і мовы. Развіццё пісьма як паказчык працэсу развіцця мыслення і мовы. Тыпы пісьма і мысленне. Нестэрэатыпнае мысленне і новыя сродкі яго выражэння.

Вербальнае мысленне. Невербальнае мысленне (наглядна-вобразнае і практычна-дзейснае).

Псіхалагічна-фізіялагічныя сувязі мовы і мыслення. Паняцце афазіі. Тыпы афазіі. Характар мыслення пры афазіі.

Характар сувязі паміж мовай і мысленнем пры білінгвізме. Асаблівасці маўленчай дзейнасці білінгваў.

Унутранае маўленне і мысленне. Паняцце ўнутранага маўлення. Вучэнне Л.С. Выгоцкага пра ўнутранае маўленне. Асноўныя тыпы ўнутранага маўлення (невакалізаванае, рэдукаванае) як розныя прамежкавыя звёны паміж мысленнем і мовай. Асаблівасці ўнутранага маўлення глуханямых.

Катэгорыі мыслення і катэгорыі мовы. Сувязь паміж мысленчымі і моўнымі катэгорыямі. Колькасныя і якасныя суадносіны (несупадзенні) мысленчых і моўных катэгорый. Слова і паняцце. Сказ і суджэнне. Супадзенні і адрозненні паміж імі. Універсальны характар лагічных катэгорый і адметнасць моўных катэгорый у розных мовах.

Мова і пазнанне. Мова як сродак набыцця, фіксацыі, перадачы ведаў і як эфектыўны інструмент пазнання. Абагульняльная, сістэматызацыйная і абстрагавальная роля мовы ў працэсе пазнання. В.Гумбальт аб ролі мовы ў працэсе пазнання. Гіпотэза лінгвістычнай адноснасці Сэпіра - Уорфа. Узаемасувязі паміж мовай, мысленнем і аб'ектыўнай рэчаіснасцю паводле гэтай гіпотэзы, яе крытычны аналіз.

**3.2. Мова як знакавая сістэма.** Агульнае паняцце пра знак і знакавую сістэму. Асноўныя задачы семіётыкі як навукі пра знакі. Тыпалогія знакаў.

Сутнасць моўнага знака. Лінгвасеміётыка як навука пра знакавы характар мовы. Найважнейшыя лінгвасеміятычныя праблемы. Унілатэральная і білатэральная тэорыі моўнага знака. Будова моўнага знака: план выражэння (азначальнае, экспанент) і план зместу (азначаемае, абазначанае), характар сувязі паміж імі. Зместавыя ўласцівасці моўнага знака. Аддюстравальны і абагульняльны характар плана зместу. Асноўныя ўласцівасці плана выражэння (знешняй формы) моўнага знака (матэрыяльнасць, лінейнасць, пабудова з абмежаванай колькасці элементаў). Істотныя прыметы моўнага знака ў цэлым (інфармацыйнасць, камунікацыйнасць, сацыяльнасць, мэтанакіраванасць выкарыстання, узнаўляльнасць). Значнасць (вартасць) моўнага знака.

Тыпалогія моўных знакаў. Спецыфіка мовы як семіятычнай сістэмы. Асноўныя моўныя знакі (фанема, марфема, слова, сказ).

Моўныя і нямоўныя знакі як сродак зносін. Паняцце пра паралінгвістыку. Паралінгвістычныя сродкі камунікацыі (фанацыйныя, кінетычныя і графічныя).

Мова і маўленне. 3 гісторыі вывучэння суадносін мовы і маўлення. В.Гумбальт пра мову і маўленне, іх суадносіны. Маўленчая дзейнасць і навука аб ёй. Кампаненты маўленчай дзейнасці. Дыферэнцыяцыя маўленчай дзейнасці ў працах Ф. дэ Сасюра і Л.У.Шчэрбы. Трактоўка мовы і маўлення А.І.Смірніцкім. Сучасныя ўяўленні пра суадносіны мовы і маўлення. Адрозненні паміж мовай і маўленнем. Адзінкі мовы і адзінкі маўлення. Паняцце пра псіхалінгвістыку. Знешнія і ўнутраныя этапы спараджэння маўлення. Галоўныя этапы ўспрымання маўлення. Сувязь працэсаў спараджэння і ўспрымання маўлення.

**3.3. Мова і грамадства.** Сутнасць мовы. Мова як універсальная агульначалавечая з'ява. Роля мовы ў эвалюцыі чалавека. Дыферэнцыйная і інтэгральная роля мовы.

Адлюстраванне ў мове патрэб, здольнасцей, духоўнай спадчыны людзей. Мова як другасная сігнальная сістэма. Мова - найбагацейшая крыніца інфармацыі і аснова чалавечага прагрэсу.

Азначэнні мовы. Дзве супрацьлеглыя ўзаемазвязаныя тэндэнцыі ў вызначэнні сутнасці мовы. Розныя лінгвістычныя канцэпцыі сутнасці мовы. Вызначэнне мовы як боскай з'явы ў часы Сярэднявечча. Погляды на мову як на індывідуальную з'яву, псіхалагічную, біялагічную, класавую.

Функцыі мовы. Камунікацыйная функцыя як наиважнейшая функцыя мовы. Кагнітыўная функцыя. Намінацыйная функцыя. Пазнавальная функцыя. Інтэграцыйная функцыя. Рэгуляцыйная (апеляцыйная) функцыя. Экспрэсіўная і эмацыйная функцыі. Фатычная (кантактаналаджвальная) функцыя. Магічная (рытуальная) функцыя. Эстэтычная (паэтычная) функцыя. Метамоўная функцыя.

Паняцце пра сацыялінгвістыку. Найважнейшыя задачы сацыялінгвістыкі.

Сацыяльная прырода мовы. Абгрунтаванне сацыяльнага характару мовы. Магчымасць жыцця чалавека па-за грамадствам і мова. Адрозненне мовы ад іншых грамадскіх з'яў. Уплыў мовы на грамадства.

Стыхійны ўплыў грамадства на мову. Грамадска абумоўленыя тыпы дыферэнцыяцыі мовы. Адлюстраванне ў мове тэрытарыяльнай, сацыяльнай і прафесійнай дыферэнцыяцыі грамадства, адрозненняў ва ўзроўні эканамічнага развіцця грамадства, духоўнай і матэрыяльнай культуры грамадства. Сацыяльныя прычыны стылістычнай дыферэнцыяцыі мовы. Уплыў на мову рэлігіі. Адлюстраванне ў мове моўных кантактаў. З'явы субстрату, суперстрату, адстрату, інстрату і перстрату.

Свядомы ўгшыў грамадства на мову. Нацыянальна-моўная палітыка. Стварэнне пісьмовасці. Рэформы (частковыя змены) графікі і арфаграфіі.

Стварэнне розных тэрмінасістэм, анамастычнай лексікі. Стварэнне штучных моў.

Паняцце пра моўную сітуацыю. Сацыялінгвістычная тыпалогія моўных сітуацый. Моўная камунікацыя ў шматнацыянальнай дзяржаве і ў міжнародным супольніцтве. Білінгвізм. Віды білінгвізму ў Беларуси (абмежаваны, змяшаны, абсалютны). Дыглосія як адметны від незбалансаванай двухмоўнасці. Полілінгвізм і яго віды.

Сацыяльнае і індывідуальнае ў мове. Літаратурная мова і яе прыметы (унармаванасць, агульнаабавязковасць, поліфункцыянальнасць, стылістычная дыферэнцыяцыя). Моўная норма і яе прыметы (выбіральнасць, устойлівасць, абавязковасць). Класіфікацыя моўных нормаў. Варыянты моўнай нормы. Літаратурная норма і узус. Суадносіны паміж літаратурнай і нацыянальнай мовамі. Функцыі літаратурнай мовы ў грамадстве. Ідыялект *як* адна з асноўных формаў існавання мовы.

Міжнародныя і сусветныя мовы. Афіцыйныя мовы ААН. Піджыны і крэольскія мовы. Шляхі вырашэння праблемы міжнацыянальных моўных кантактаў. Віды камунікацыі ў грамадстве.

Сацыяльна абумоўленыя з'явы ў мове. Формы сацыяльнага існавання нацыянальнай мовы: агульнараспаўсюджаныя (літаратурныя, прастамоўныя) і абмежаваныя (сацыяльныя і тэрытарыяльныя дыялекты).

Сістэма і структура мовы. Паняцце пра сістэму мовы. Узаемаабумоўленасць элементаў сістэмы мовы. Паняцце пра структуру мовы.

Іерархічная будова знакавых сістэм. Узроўні знакавай сістэмы мовы, крытэрыі іх вылучэння. Іерархічная сувязь паміж рознымі ўзроўнямі. Парадыгматычныя, сінтагматычныя і іерархічныя адносіны паміж аднароднымі адзінкамі моўных узроўняў. Адметнасць сінтагматычных адносін адзінак розных моўных узроўняў. Камбінацыі моўных адзінак, якія не вядуць да ўтварэння новага ўзроўню. Іерархічныя адносіны. Тэорыя ізамарфізму ўзроўняў мовы. Тэорыя іерархіі моўных узроўняў. Сістэмныя і несістэмныя з'явы ў мове. Інварыянтна-варыянтная суадноснасць адзінак мовы ("эмічныя" і "этычныя" адзінкі мовы). Узроўні мовы і ўзроўні аналізу мовы.

Адрозненне мовы ад іншых знакавых сістэм.

**3.4. Фаналогія.** Статус фаналогіі. Раздзелы фаналогіі.

Фанетыка. Раздзелы фанетыкі. Акустычная характарыстыка гукаў. Сіла, вышыня, працягласць і тэмбр. Тоны і шумы. Сегментныя і суперсегментыя (прасадычныя) акустычныя з'явы.

Артыкуляцыйная характарыстыка гукаў. Прынцыпы класіфікацыі галосных і зычных гукаў.

Фанеміка. Перадумовы ўзнікнення навукі пра фанемы. Паняцце фанемы. Функцыі фанемы. Прыметы фанем (фаналагічна істотныя і фаналапчна неістотныя). Пазіцыі фанем. Асноўны алафон. Варыянт фанемы. Варыяцыі фанемы (пазіцыйныя, тэрытарыяльныя, індывідуальныя). Сістэма фанем. Спалучальнасць фанем. Тэорыі фанемы

І.А. Бадуэна дэ Куртэнэ (марфалагічная, псіхалагічная, антрапафанічная). Вучэнне Л.У. Шчэрбы пра фанему. Вучэнне М.С. Трубяцкога пра фанему. Тэорыя апазіцый як аснова апісання структуры фанем. Класіфікацыя тыпаў апазіцый. Апазіцыйныя правілы вылучэння фанем. Паняцце пра фанемную дыстрыбуцыю. Універсальны бінарны прынцып у фаналогіі. Асноўныя адрозненні ў вучэнні пра фанему прадстаўнікоў Маскоўскай і Ленінградскай фаналагічных школ. Пражская школа ў фаналогіі.

**3.5. Граматыка.** Граматыка як лад мовы і як навука. Раздзелы граматыкі і аб'ект іх вывучэння.

Граматычнае значэнне і яго супрацьіастаўленасць лексічнаму значэнню. Тыпы граматычных значэнняў (сінтаксічнае, класіфікапыйнае, мадальнае, намінацыйнае). Сувязь граматычнага і лексічнага значэнняў. Паняцце граматыкалізацыі і лексікалізацыі. Суадносіны граматычнай і лексічнай семантыкі ў мовах свету. Спосабы выражэння граматычных значэнняў. Агульная характарыстыка марфалагічных і немарфалагічных спосабаў выражэння граматычных значэнняў. Асаблівасці выражэння граматычных значэнняў у розных мовах.

Граматычная катэгорыя. Унутраная структура граматычнай катэгорыі. Паняцце пра грамему. Адметнасць граматычных катэгорый у мовах свету. Прыхаваныя граматычныя катэгорыі і спосабы іх выяўлення. Бінарны прынцып апісання граматычных з'яў. Аналіз і сінтэз граматычных катэгорый. Лексічна-граматычныя катэгорыі (разрады слоў).

Граматычная форма. Парадыгма моўнай адзінкі. Словаформа.

Часціны мовы. Статус часцін мовы. Прынцыпы класіфікацыі слоў па часцінах мовы. Адметнасць часцін мовы ў розных мовах.

Сінтаксіс. Раздзелы сінтаксісу. Асноўныя кірункі сінтаксісу. Сказ як наиважнейшая адзінка сінтаксісу і яго асноўныя адзнакі Канцэпцыі вывучэння сказа. Парадыгма сказаў. Глыбінная і паверхневая структуры сказа. Сказ і выказванне. Члены сказа. Пытанне пра іерархічную вяршыню сказа. Крытэрыі класіфікацыі дадaных членаў сказа. Члены сказа і часціны мовы. Словазлучэнне. Словазлучэнне і сінтагма. Мадэлі словазлучэнняў і сказаў. Віды злучальных і падпарадкавальных сувязяў слоў у словазлучэннях і сказах.

Актуальны падзел выказвання. Сказ і тэкст.

Кірункі і метады сінтаксічных даследаванняў. Вербацэнтрызм (граматыка Тэньера). Граматыка непасрэдна складальных. Прынцып бінарнага падзелу сказа. Цяжкасці сінтаксічнага аналізу сказаў пры дапамозе граматыкі непасрэдна складальных. Трансфармацыйная граматыка і яе магчымасці. Глыбінная і паверхневая структура сказа.

Мадэль "Сэнс <—> Тэкст".

**3.6. Марфеміка.** Паняцце марфемы. Найважнейшыя прыметы марфемы (паўтаральнасць, значэнневасць, непадзельнасць,

абстрактнасць). Дыскусійныя пытанні марфемікі. Праблемы марфемнага аналізу слова. Спалучальнасць марфем.

Словаўтварэнне. Статус словаўтварэння. Асноўныя паняцці словаўтварэння (матываванасць, словаўтваральнае значэнне, словаўтваральная вытворнасць, словаўтваральнае правіла). Адзінкі словаўтварэння (субстанцыйныя і класіфікацыйныя). Паняцце словаўтваральнай сістэмы і словаўтваральнага тыпу. Спосабы словаўтварэння ў розных мовах. Словаўтварэнне і ўзроўні мовы.

Марфаналогія. Асноўныя задачы марфаналогіі. Паняцце пра марфанему. Спроба выяўлення універсальных асаблівасцей марфаналагічных сістэм розных моў.

**3.7. Лексікалогія.** Раздзелы лексікалогіі. Асноўныя праблемы агульнай лексікалогіі. Праблемы вызначэння слова. Слова, лексема, словаформа. Паняцце пра сему. Сема і яе тыпы (інтэграцыйная і дыферэнцыйныя). Слова як двухбаковая адзінка мовы. Асіметрыя плана зместу і плана формы ў слове. Структура плана зместу слова. Лексічная, словаўтваральная і граматычная семантыка слова. Адрозненне паміж лексічным значэннем слова і паняццем. Структура лексічнага значэння слова. Аспекты лексічнага значэння (дэнататыўны, сігніфікатыўны, прагматычны). Нацыянальна-культурны кампанент лексічнага значэння слова. Значнасць як уласна лінгвістычны аспект лексічнага значэння слова. Значэнне і сэнс слова. Унутраная форма слова.

Лексічна-семантычная сістэма мовы. Віды семантычных адносін у лексіцы. Парадыгматычныя і сінтагматычныя адносіны як найболыш абагульненыя і універсальныя адносіны паміж словамі. Разнавіднасці парадыгматычных і сінтагматычных адносін слоў. Паняцце пра лексічную спалучальнасць слоў. Эпідыгматычныя адносіны ў лексіцы.

Прадметна-тэматычныя аб'яднанні слоў. Уласна лінгвістычныя крытэрыі тэматычнай класіфікацыі лексікі. Прадметна-тэматычныя групы слоў і семантычныя палі.

Іерархічная арганізацыя лексічнай сістэмы. Імплікацыйныя адносіны семантычнага падпарадкавання "частка - цэлае", "від - род" у лексіцы. Паняцце гіпаніміі і гіпераніміі. Асаблівасці гіпанімічна-гіперанімічных адносін у розных мовах.

Полісемія. Тыпы полісеміі (радыяльная, ланцужковая, камбінаваная). Кантэкст і яго віды. Паняцце прэсупазіцыі. Паняцце пра семантэму.

Сінанімія. Знешнія і ўнутраныя прычыны існавання ў мове сінонімаў. Ступень сінанімічнасці. Характар сінанімічнай арганізацыі лексікі. Тыпы сінонімаў. Сінанімія і полісемія. Сінанімізацыя. Функцыя сінонімаў у маўленні. Антанімія. Лексічная антанімізацыя і тыпы антонімаў.

Канверсія. Паняцце пра канверсівы.

Тэрміналагічная і анамастычная лексіка і яе асаблівасці. Функцыянальныя і фармальна-граматычныя асаблівасці тэрмінаў. Адметныя рысы онімаў.

Фразеалогія. Статус фразеалогіі. Фразеалогія ў шырокім і ў вузкім сэнсе. Дыскусійныя пытанні фразеалогіі. Найважнейшыя знешнія крытэрыі вылучэння фразеалагічных адзінак - звышслоўнасць і ўзнаўляльнасць. Унутраныя крытэрыі сістэматызацыі фразеалагічнага матэрыялу. Класы ўстойлівых звышслоўных адзінак. Фразеалагізм і слова. Фразеалагізм і словазлучэнне. Віды залежнасці паміж кампанентамі фразеалагізмаў і яе адрозненне ад аналагічных адносін паміж лексемамі ў свабодных словазлучэннях. Фразеалагізм і сказ. Крытэрыі фразеалагічнасці.

Класіфікацыі фразеалагізмаў (семантычная, марфалагічная, структурная, этымалагічная, стылістычная, намінацыйна-функцыянальная). Спецыфіка семантыкі фразеалагізмаў. Унутраная форма фразеалагізмаў. Характар суадносін паміж унутранай формай і значэннем фразеалагізма. Сістэмнасць фразеалогіі. Полісемія і аманімія ў фразеалогіі. Адметнасць сінанімічных і антанімічных адносін у фразеалогіі.

Варыянтнасць у фразеалогіі. Тыпы фразеалагічных варыянтаў.

Паняцце пра фразеалагічную дэрывацыю. Прадукцыйныя і непрадукцыйныя мадэлі ўтварэння фразеалагізмаў.

Нацыянальна-культурная семантыка фразеалагічных адзінак. Праблемы перакладу фразеалагізмаў.

Пытанне пра фразеалагічны ўзровень мовы.

**3.8. Мова як гістарычная з'ява.** Своеасаблівасці развіцця мовы. Тэорыі (канцэпцыі) развіцця мовы (В. Гумбальта, натуралістычная А. Шляйхера, псіхалагічная Г. Штайнталя і А.А. Патабні, младаграматычная, сацыяльная, стадыянальная), іх моцныя і слабыя бакі. Змяненне, развіццё, функцыянаванне і ўдасканаленне мовы. Прагрэс у развіцці мовы (адносны, абсалютны). Найважнейшыя прынцыпы развіцця мовы.

Знешнія прычыны моўных змен. Стыхійныя прычыны змяненняў мовы - сацыяльна-эканамічныя фактары, міграцыя насельніцтва. Кантактаванне моў і яго асноўныя вынікі (запазычванне лексікі і фразеалогіі, засваенне артыкуляцыйных асаблівасцей іншай мовы, змена характару націску, змена граматычнага ладу мовы, запазычванне афіксаў). Асноўныя працэсы, дэтэрмінаваныя кантактаваннем моў (дыферэнцыяцыя і інтэграцыя). Моўны саюз. Інтэрферэнцыя. Прынцыпы моўнай эканоміі. Стварэнне пісьмовасці, унармаванне мовы, узнікненне кнігадруку і сродкаў масавай інфармацыі, рэформы графікі і арфаграфіі, складанне розных тэрмінасістэм, клопаты пра культуру мовы і іншае як праявы свядомага ўздзеяння грамадства на мову.

Унутраныя прычыны моўных змен. Антыноміі і іх уплыў на самаразвіццё мовы. Асноўныя антыноміі ў мове (азначальнага і

азначаемага мочага знака, моўнай сістэмы і нормы, коду і тэксту, шфармацыйнай і экспрэсгунай функцый мовы, наяўных моўных сродкаў і патрэб перадачы новай інфармацыі і інш.). Асноўныя тэндэнцыя ўдасканалення мовы. Сістэмны характар моўных змен.

Фанетычныя змяненні ў мове. Чаргаванне гукаў. Канвергенцыя і дывергенцыя гукаў. Фактары фанетычна-фаналагічных змяненняў (экстралінгвістычныя, сістэмны, артыкуляцыйна-акустычныя). Змяненні ў фанетычнай сістэме пад уздзеяннем іншых моў.

Граматычныя змяненні ў мове. Колькасныя і якасныя змены ў граматыцы. Змяненні па аналоги як аснова граматычных змяненняў. Змены ў марфалогіі і сінтаксісе. Семантычная абумоўленасць граматычных працэсаў. Сістэмны фактар змяненняў у граматыцы. Адметнасць граматычных змяненняў у розных мовах. Іншамоўны ўплыў на граматыку.

Лексічныя змяненні ў мове. Узнікненне новых слоў і новых значэнняў. Пераход слоў з актыўнага запасу ў пасіўны. Перадумовы страты лексем. Шляхі ўзбагачэння слоўніка мовы: словаўтварэнне, запазычванне, калькаванне, пераасэнсаванне слоў. Спосабы змянення лексічных значэнняў. Звужэнне і пашырэнне семантычнага аб'ёму слова. Неаднолькавыя тэмпы змянення розных відаў лексічных значэнняў. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексічна-семантычнай сістэмы мовы.

Семантычныя змяненні ў мове і іх найважнейшыя прычыны. Колькасны і якасны характар семантычных змен. Тыпалогія семантычных змяненняў.

Заканамернасці і тэмпы моўных змен. Асноўныя законы развіцця мовы (закон эвалюцыйнага развіцця, закон нераўнамернага развіцця розных узроўняў мовы, закон развіцця мовы па аналогіі). Тэмпы моўных змен адзінак аднаго ўзроўню мовы на розных этапах яе гісторыі. Нераўнамернае развіццё розных моў і яго прычыны. Асаблівасці гістарычных змен у розных мовах. Асноўныя кірункі сацыяльнай эвалюцыі моў.

**3.9. Лінгвістычная тыпалогія.** Лінгвістычная тыпалогія як адзін з відаў сістэматызацыі моў. Папярэднікі і заснавальнікі тыпалогіі моў. Агульнае і рознае паміж тыпалогіяй моў і лінгвістыкай універсалій.

Моўнае падабенства і класы моў. Генетычнае падабенства і моўная сям'я. Арэальнае падабенства і моўны саюз. Тыпалагічнае падабенства і моўны тып.

Тыпалагічная класіфікацыя моў. Сістэматызацыя тыпалагічных падабенстваў моў (тыпалагічная заканамернасць, моўны тып, лінгвістычная універсалія, лінгвістычная фрэквенталія). Асноўныя кірункі тыпалагічных даследаванняў. Тыпалагічныя класіфікацыі і характаралогія моў.

Фанетычна-фанематычная тыпалогія моў. Вакалічныя і кансанантныя мовы. Складовыя і нескладовыя мовы.

Марфалагічныя тыпы моў. Аналітычныя і сінтэтычныя мовы. Аглютынацыйныя і фузійныя мовы. Ізаляцыйныя і інкарпарацыйныя мовы.

Сінтаксічная тыпалогія. Прадмет і задачы тыпалагічнага сінтаксісу. Намінатыўны, эргатыўны, актыўны, класны і нейтральны лад мовы. Тыпалагічная класіфікацыя моў Л. Тэньера ("дацэнтрабежныя" і "адцэнтрабежныя" мовы).

Лексічная тыпалогія моў. Адметнасць лексічнай тыпалогіі моў. Аб'ём слоўніка мовы. Семантычна-тэматычныя групы лексікі. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі. Шляхі папаўнення слоўніка мовы (марфемная дэрывацыя, семантычная дэрывацыя, утварэнне несвабодных спалучэнняў, запазычанні).

Функцыянальная (сацыялінгвістычная) тыпалогія моў. Прадмет функцыянальнай тыпалогіі моў. Функцыянальна істотныя характарыстыкі моў. Камунікацыйныя рангі моў: сусветныя, міжнародныя, нацыянальныя (дзяржаўныя), рэгіянальныя, мясцовыя.

Юрыдычны статус моў: дзяржаўная мова, афіцыйная, нацыянальная, часова дзяржаўная, афіцыйная мова штата, мова саюзнай (аўтаномнай) рэспублікі, мова міжнацыянальных зносін, мова нацыянальных меншасцяў, мова народнасці і інш.

Дыпламатычныя рангі моў. Афіцыйныя мовы ААН, АБСЕ, ЕС.

Прароцкія і апостальскія мовы.

Навучальна-педагагічны статус моў (дапаможны сродак пры навучанні другой мове, мова навучання, вучэбны прадмет).

Класічныя мовы і іх характэрныя прыметы.

Лінгвістычная універсалогія. Паняцце моўных універсалій. Сістэматызацыя універсалій (абсалютныя і статыстычныя, простыя і складаныя, моўныя і маўленчыя, статычныя і дынамічныя, аднаўзроўневыя і міжузроўневыя). Фанетычна-фаналагічныя універсаліі. Марфалагічныя універсаліі. Сінтаксічныя універсаліі. Лексічныя і лексічна-семантычныя універсаліі.

**4. Метады даследавання мовы.** Агульнае паняцце пра метад, метадалогію. Прынцыпы класіфікацыі навуковых метадаў. Сувязь метадаў і метадалогіі. Абумоўленасць выбару лінгвістычных метадаў даследавання.

Традыцыйныя метады вывучэння мовы (агульная характарыстыка).

Апісальны метад як адзін з шырокараспаўсюджаных метадаў. Асноўныя кампаненты апісальнага метаду (назіранне, абагульненне, інтэрпрэтацыя, класіфікацыя) і іх сутнасць. Прыклады выкарыстання апісальнага метаду пры аналізе (характарыстыцы) розных моўных з'яў (адзінак).

Супастаўляльны метад. Выкарыстанне супастаўляльнага метаду пры сінхранічным і дыяхранічным аналізе моўных з'яў. Супастаўленне ўнутрымоўных і міжмоўных лінгвістычных фактаў. Найболын значныя

лінгвістычныя адкрыцці з дапамогай супастаўляльнага метаду. Супастаўляльная фанетыка, граматыка, лексікалогія.

Параўнальна-гістарычны метад. Сутнасць параўнальна-гістарычнага метаду. Паняцце знешняй і ўнутранай рэканструкцыі. Найважнейшыя адкрыцці з дапамогай параўнальна-гістарычнага метаду.

Метад лінгвістычнай геаграфіі. Асноўныя этапы лінгвагеграфічнага вывучэння моўных з'яў. Дыялекталагічныя атласы і іх тыпы.

Найноўшыя метады даследавання мовы (агульная характарыстыка). Структурныя метады. Асноўныя палажэнні структуралізму ў лінгвістыцы.

Дыстрыбуцыйны метад. Этапы дыстрыбуцыйнага аналізу. Тыпы дыстрыбуцыі паміж элементамі (кантрастная, дадатковая, свабоднае вар'іраванне).

Метад непасрэдна складальных. Асноўныя прынцыпы метаду. Недахопы метаду.

Трансфармацыйны метад. Сутнасць метаду і яго асноўныя прынцыпы. Інтэрпрэтацыя сінтаксічных з'яў з дамагогай трансфармацыйнага метаду.

Метад кампанентавага аналізу. Прынцыпы вылучэння дыферэнцыйных прыкмет. Выкарыстанне метаду кампанентавага аналізу пры даследаванні фанем, граматычных, лексічных і семантычных з'яў.

Колькасныя метады. Прызначэнне гэтых метадаў.

Эксперыментальныя метады. Выкарыстанне экспрыметальных метадаў у фанетыцы, сінтаксісе, лексікаграфіі і стылістыцы.

Сацыялінгвістычныя метады. Асноўныя кампаненты сацыялінгвістычнага метаду (непасрэднае назіранне, анкетаванне, інтэрв'ю, аналіз дакументальных крыніц, карэляцыйны аналіз).

Псіхалінгвістычны метад. Сутнасць псіхалінгвістычнага метаду, яго разнавіднасці і сфера выкарыстання.

Нейралінгвістычныя метады. Сутнасць нейралінгвістычных метадаў і іх найважнейшыя тыпы. Сфера выкарыстання нейралінгвістычных метадаў.

# ЛІТАРАТУРА

## Асноўная

Алпатов В.М. История лингвистических учений. 4-е изд. М., 2005.

Гируцкий А.А. Общее языкознание. Мн., 2003.

Кондратов Н.А. История лингвистических учений. 3-е изд. М., 2006.

МасловаВ.А. Когнитивная лингвистика. Мн., 2004.

Маслова В.А. Лингвокультурология. М., 2001.

Мечковская Н.Б., Норман Б.Ю., Плотников Б.А., Супрун А.Е. Общее языкознание: Структура языка. Типология языков и лингвистика универсалий. 2-е изд. Мн., 1995.

Мечковская И.Б., Плотников Б.А., Супрун А.Е. Общее языкознание: Сущность и история языка. 2-е изд. Мн., 1993.

Мечковская Н.Б. Социальная лингвистика. 2-е изд. Мн., 2004.

Плотнікаў Б.А. Агульнае мовазнаўства. Мн., 1994.

Плотников Б.А. Общее языкознание: Семинарий. Мн., 1986.

Рагаўцоў В.І. Агульнае мовазнаўства. Магілёў, 2006.

Рагаўцоў В.І. Псторыя мовазнаўства. Магілёў, 2005.

Рагаўцоў В.І. Практыкум па гісторыі агульнага мовазнаўства. Мн., 2001.

Рагаўцоў В.І. Агульнае мовазнаўства: Практыкум. Магілёў, 2007.

## Дадатковая

Алефйренко Н.Ф. Современные проблемы науки о языке. М., 2005.

Амирова Т.А., Ольховиков Б.А., Рождественский Ю.В. История языкознания. М., 2007.

Амирова Т.А. Из истории лингвистики XX века: структурно-функциональное языкознание (истоки, направления, школы). М., 1999.

Белянин В.П. Психолингвистика. М., 2003.

Березин Ф.М. История советского языкознания: Некоторые аспекты общей теории языка: Хрестоматия. 2-е изд. М., 1988.

Горелов И.Н., Седов К.Ф. Основы психолингвистики. 3-е изд. М., 2001.

Засорина Л.Н. Введение в структурную лингвистику. М., 1974.

История лингвистических учений: Древний мир. Л., 1980.

История лингвистических учений: Средневековая Европа. Л., 1985.

История лингвистических учений: Средневековый Восток. Л., 1981.

Кодухов В.И. Общее языкознание. М., 1974.

Левицкий Ю.А. Общее языкознание. 3-е изд. М., 2008.

Леонтьев А.А. Основы психолингвистики. 4-е изд. М., 2005.

Лингвистика XX века: система и структура языка: хрестоматия: в 2 ч. / сост. Е.А.Красина. М, 2004. - Ч. 1.

Лингвистика XX века: система и структура языка: хрестоматия: в 2 ч. / сост. Е.А.Красина. М., 2004. Ч. 2.

Мечковская Н.Б. Семиотика: Язык. Природа. Культура. 2-е изд. М., 2007.

Мечковская Н.Б. Общее языкознание: Структурная и социальная типология языков. 5-е изд. М., 2007.

Общее языкознание: Хрестоматия / Сост. Б.И.Косовский, Н.А.Павленко. 2-е изд. Мн., 1987.

Рождественский Ю.В. Лекции по общему языкознанию. 2-е изд. М., 2000.

Супрун А.Е. Лекции по теории речевой деятельности. Мн., 1996.

Супрун А.Е. Лекции по языковедению. Мн., 1978.

Сусов И.П. История языкознания. М., 2006.

Фрумкина Р.М. Психолингвистика. М., 2001.

Широков О.С. Языковедение: Введение в науку о языках. М., 2003.

Шулежкова С.Г. История лингвистических учений. 3 изд. М., 2007.

Эйчысан Д. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псіхалінгвістыку. Мн., 1995.

## Слоўнікі

Ахманова О.С. Словарь лингвистических терминов. 4-е изд. М., 2007.

Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мн., 1994.

Булахов М.Г. Восточнославянские языковеды: Биобиблиографический словарь: В 3 т. Т. 1-3. Мн., 1976 - 1978.

Васильева Н.В., Виноградов В.А., Шахнарович А.М. Краткий словарь лингвистических терминов. 2-е изд. М., 2003.

Лингвистический энциклопедический словарь. 2-е изд. М., 2002.

Марузо Ж. Словарь лингвистических терминов. 2-е изд. М., 2004.

Розенталь Д.Э., Теленкова М.А. Словарь-справочник лингвистических терминов. М., 2007.

Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк Л.А. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. Мн., 1990.